№ 73 Ausgabe B·

ГОМАН

Цана з перасылкай і дастаукай да хаты:
на 1 год—10 м. 80 фэн., на ½ году—5 м. 40 ф., на 3 месяцы — 2 м. 70 ф., на 1 мес. — 90 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цана абвестак:
на 4-ай старане за радок дробнымі літарамі — 25 фэніг.; дробныя абвесткі— па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 73 (269). Год III. Вільня, 17 верасьня 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

16 верасьня.

Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генэрал ан-шэфа ф. Бэн'а: У даліне Ліс і на паўдня ад каналу Лабасэ мы рабілі шчасьлівыя прадпрыемствы. Між Гаврэнькур і Епегі нараніцы заўзятая артылерыская бітва. Часткавыя наступленьні непрыяцеля адкінены. У дзень пяхотныя бітвы ля Вэрман, ля лесу Гольпон і ля Эсіні Лё Гранж.

Фронт нямецкага Насьледніка: Заўзятыя мясцовыя бітвы між Айет і Ень. Пасьля адкіненых наступленьняў нараніцы непрыяцель узноў атакаваў увечары. Наагул ён адкінены. Паўднёвую часьць Ваі ён заняў. Між Ень і Вэльмы ад французаў адбілі адрэзкі акопаў, занятыя імі ў бітвах 14 верасьня.

Фронт Гальвіца: Ад Кот Лёрэнь да Мозэля артылерыйская бітва адвячоркам. Перад нашымі новымі пазіцыямі пачаліся заўзятыя пяхотныя бітвы, у каторых мы ўзялі палонных. Вечаром непрыяцель стаяў на лініі Фрэнь-Сэн-Гілер-Гомон-Ранбаркур лэс Нар.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскага: Наступленьні ворага на Лётарынскім фронце адкінены.

У адказ на пастаяннае абкіданьне нямецкіх мест бомбамі нашы лятуны абкідалі ў тую ноч Парыж 22 ма тысячамі кілям бомб. Мы зьбілі ўчора 24 варожых самалёты і 15 шароў на прывязі.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 15 IX. «Nord Deut. Alg. Zeg.» піша:» прадлажэньне Аўстра-Вэнгрыі ваюючым старонам служыць довадам сурьёзнай да міру. Калі ёсьць сумлевак аб удачы кроку нашага саюзьніка, дык ён ёсьць рэзультатам нашых ранейшых няўдачных пробвыбавіць Еўропу ад разрываючай яе вайны. У кожным здарэньні няма сумлеўку ў гатоўпасьці нямецкага ўраду зараз-жа прыступіць да, перагавораў, калі яны пачнуцца з прычыны прадлажэньня аўстрыяцкага ўраду".

МАСКВА (В.Т.Б.). 14.IX. На ноту з протэстам дыплёматычнага корпуса ў Пецярбурзе з 5 верасьня проці чырвонага тэррора, «Ізвестія» публікуюць вельмі рэзкую ноту Чічэрына, адказ каторай кажа: «Мы адхінаем найстанаўчэй усякае ўмешаньне нэўтральных капіталістычных дзяржаў на карысьць расейскай буржуазіі і мы заяўляем, што мы кожную спробу прадстаўнікоў гэтых дзяржаў перайсьці граніцу абароны іх падданых будзем разглядаць як спробу паддзержываць расейскую контррэвалюцыю.

МАСКВА (В.Т.Б. 14.IX. „Правда» публікуе загад Троцкага, згодна з каторым чэха-славакі захапілі часьць дзяржаўнага золата ў Казані. Загадаваецца ўсім прыняць меры, каб гэна золата ня было вывезена заграніцу праз Архангельск або Владывасток. Пасьля усьмірэньня чэха-славакоў на Волзе, на Урале і ў Сібіры ўсе вінаватыя будуць цяжка пакараны.

ПЕЦЯРБУРГ (В.Т.Б.). 12.IX. У районе 4 армі раскрыта, як наказваюць газэты, вялікая змова. Начальнік уральскіх дывізый, належачых да 4 арміі, Штомбах, дастаў прадлажэньне ад саюзьнікаў прадаць 4 армію. Аб гэтым прадлажэньні ён наказаў пачальству.

КІЕУ (В.Т.Б.). 15.IX. Украінскае тэлеграфнае агенцтва піша: «У Крыме міністэр культа, міністэр емінных спраў, памочнік міністра ўнутраных спраў і гасударственны контролер не маглі згадзіцца аб разьвязцы пытаньня аб адносінах да Украіны і вышлі ў адстаўку.

ЛОНДОН. (Рэўтэр). 16.IX. Параход „Galway Castel“ 7988 тонн па дарозе ў паўднёвую Афрыку затоплены падводнай лодкай. Згінуло 34 чал. экіпажа і 120 пасажыраў. Паўднёва-афрыканскі міністэр Бэртэн уцалеў.

ВЕНА. (корэспанд. бюро) 15.IX. З Масквы наказываюць: узброеная банда зробіла напад на емінны саюз. Разбойнікі захапілі 300 тысяч рублёў і ўцяклі.

Аўстрыя за мір.

БЭРЛІН. (В.Т.Б.). Аўстрыяцкі ўрад запрэсіў урады ваюючых краёў абмяняцца паглядамі ў якім небудзь нэўтральным месцы. Аб гэтым нэўтральным дзяржавам наказана асобнай нотай.

Урадова наказаваюць для аб'ясьненьня гэтага кроку, што ўсе народы скарэй хочуць скончыць крываву вайну. Дзеля таго, што ўсе крокі, прынятыя дагэтуль у гэтым кірунку не далі ніякіх рэзультатаў, трэба прыняць больш энэргічныя меры. Ува ўсіх ваюючых гасударствах памалу ўзмацоўваецца думка, што гэтую вайну трэба скончыць не аружжам, а паразуменьнем. Далейшая вайна дасьць гэткія няшчасьці, што навет пабіўшы ня будзе мець ніякай карысьці. Толькі мір паразуменьня можа быць даўгі і карысны. Каб дапяць гэткага міра канечна патрэбна менка паглядамі між адпавядальнымі фактарамі ваюючых краёў. Гутарка павінна быць ня толькі аб варунках самага міра між ваюючымі старонамі, але таксама і аб агульных прынцыпах міжнародных адносін. Пасьля таго, як гутарка аб гэткіх прынцыпах дойдзе да вядомага рэзультату, можна будзе пачаць тарнаваць гэтыя прынцыпы да асобных пытаньняў і гэткім парадкам прабаваць іх разьвязаць. Ваенныя дзейнасьці падчас перагавораў спынены ня будуць.

Перагаворы будуць даўгія і будуць мець вялікія труднасьці, але ваюючыя староны абавязаны аддаць гэты доўг людзкасьці і папрабаваць усім разам скончыць страшную, поўную ахвяр і ўсё яшчэ не станоўчую вайну.

Аўстрыяцкі ўрад прапануе ваюючым краём паслаць дэлэгатаў у азначанае месца і ў азначаны час, каб абсудзіць асноўныя прынцыпы міра, і адкрыта і шчыра абмяняцца паглядамі ў пытаньнях, каторыя будуць разьвязавацца.

Задачы мамэнту

Кожын дзень прыносіць нам усё новыя і новыя весткі аб павароце да роднага краю сыноў Беларускага народу, каторыя тры гады былі адрэзаны ад нас ваенным фронтам. Маем ужо і прафэсароў вышэйшых школ — беларусаў, і праваслаўных сьвяшчэнікаў, ксяндзоў, і прадстаўнікоў розных вольпрафэсій; маем, ўрэсьці, сэцяг колішніх вучыцялёў расейскіх школ і бяз ліку сялян і рабочых людзей. І ўсе яны, прыяжджаючы да Бацькаўшчыны, шукаюць, на якім полі прылажыць свае сілы да працы на карысьць як агульную, так і асабістую.

Праўда, многа іх не даяжджае да Вільні: шмат каго прыцягавае работа ў закордоннай Беларусі—ў Менску, дзе ўтварыўся цэнтр беларускай гасударственасьці. Але многа ўжо прыехала і да нас, ды йшчэ больш зьбіраецца прыехаць, —і вось перад намі ўзьнімаецца пытаньне: як найляпей выкарыстаць гэту новую жывую сілу для беларускай справы?

Пакуль у межах старой окупацыі не пачалася шырэйшая праца над будаваньнем дзяржаўнага жыцьця, пакуль беларусы ўсё яшчэ знаходзяцца здалёк ад праектаваных гасударственых установ, датуль для цэлага сьцягу беларускіх інтэлігэнтаў трудна знайсьці работу, каторая дала-бы магчымасьць выкарыстаць для краю іх сілу і забасьпечыць ім быт. Праўда, мы здалелі ўжо стварыць важнейшыя ўстановы, у рамкі каторых укладаецца нашае грамадзкае і нацыянальнае жыцьцё і каторым трэба чым больш інтэлігэнтных працаўнікоў (Беларуская Рада, Беларускае Навуковае Таварыства, Беларускі Камітэт, газэты і г. п.); але ўсе яны ня могуць даць матэр'яльнага забасьпечаньня тым, хто ў іх працуе.

Найлепш прылажыць да дзела свае сілы могуць с-паміж інтэлігэнтных прафэсій вучыцялі. Патрэба асьветы ў роднай мове, гэтак доўга бышай забароненай, патрэба беларускіх школ выяўляецца вельмі ярка, і вучыцялі народных школ, добра знаючыя беларускую мову, могуць заўсёды знайсьці занятак у сваей-жа роднай вёсцы. Праўда, што вучыць пабеларуску ім дагэтуль не даводзілася, і вось, каб ім прыйсьці на помач, каб падгатаваць іх, як сьлед, да іх важнай задачы, трэба канечна арганізаваць *каротка-тэрміновыя курсы*, на якіх вучыцялі колішніх расейскіх школ маглі-бы добра пазнаёміцца з беларускай літэратурнай мовай, з беларускай, граматыкай, пісьменствам, гісторыяй. Курсы, ладжаныя ў Сьвіслацкай сэмінарыі, назначаны для такіх вучыцялёў, каторым патрэбна агульная падгатоўка да вучыцельскай прафэсіі і будуць трываць цэлы год,—а для тых старых вучыцялёў, якія варочаюцца з Расеі, патрэбна толькі падгатоўка да вучэньня дзяцей *пабеларуску*—так сама, як раней яны вучылі парасейску.

Але гэта—толькі малая частка таго, што мы павінны зрабіць. Перад намі стаіць яшчэ адна важная культурная задача, якой нельга адкладаць. Бо разам з бацькамі варочаюцца да нас і дзеці бе-

ларускія ў такім веку, што іх пара ўжо аддаваць у гімназію, а такжа такія, што пачалі хадзіць у расейскія гімназіі ў Расеі ды прымушаны цяпер кінуць навуку. Яны дома павінны знайсьці магчымасьць вучыцца далей. Ведама, аб расейскай гімназіі ня можа быць гутаркі з розных прычын. Тым хутчэй трэба адкрыць гімназію *беларускую* ў роднай мове нашых дзяцей.

Мы ня можам прайсьці моўчкі міма вялізарнай патрэбы *спэцыальных школ*, як патрэбных для тых, хто будзе гаспадарыць на ральлі, так і школ тэхнічных падобных да вывезенай з Вільні хымічнай школы, толькі лепш прытарнаваных да вымог нашага жыцьця. На гэта павінны знайсьціся ахвочыя людзі, бо попыт на навуку ў іх будзе вялікі: трэба-ж узгадаваць работнікаў дзеля адбудовы зруйнаванага вайной краю!

Вось, найпільнейшыя задачы мамэнту ў сфэры культурнай працы. Але, кажучы аб іх, мы ні на адну мінуту не павінны забывацца, што адна толькі культурная праца без будаваньня эканомічных фундамэнтаў усяго ня зробіць. На апошняе мы і зварочываем увагу тых, каму гэткая праца больш да спадобы, больш адпавядае іх знаньням і прафэсіі.

Г. Б.

ШТУТГАРД. Нямецкі віцэ-канцлер, ф. Паер, у аднэй публічнай прамове паміж іншым сказаў:

«Акраінныя гасударствы, сумежныя з Нямеччынай і Балтыцкім морам, ня могуць быць намі пакінены на злую ці добрую долю; іх нельга проці іх волі аддаць назад расейскаму царызму і паставіць перад небасьпекай бітв у грамадзкай вайне і анархіі. На ўсходзе мы маем мір і захаваем яго, ня гледзячы, ці гэта будзе да спадобы нашым ворагам, ці не».

„Сьветач мінуушчыны".

«З сьветачам мінуўшчыны йдзеце ў цемру будучыны.» З гэткімі словамі зьвярнуўся польскі гісторык Кубаля да свайго народу ў адказ на прывітаньне ў 80-я ўгодкі яго радзін.

З такім-ж словамі можна зьвярнуцца і да кожнага іншага народу, каторы мае мінуўшчыну: бо толькі знаньне таго, што было, дае магчымасьць бачыць дарогу будучыны.

Народ беларускі мае вялікую і слаўную прошласьць. Зышоўшыся з суседнім народам літоўскім, каторы залёг ад вякоў на дарозе да вольнага мора, беларусы разам з літвінамі стварылі некалі сваю незалежную дзяржаву, даўшы літвіном сваё пісьменства, сваю цывілізацыю. Вялікае Князьства Літоўскае было літоўскім толькі па імю, але па культуры — беларускім. А вечныя памяткі старой беларускай культуры сьведчаць красамоўна аб творскай сіле нашага народу, ствaрыўшага ў мінуўшчыне сваю дзяржаўнасьць, сваё права, сваю літэратуру, сваё мастацтва...

Пайдзеце на выстаўкі старасьвеччыны нашага краю і паўглядайцеся, што тамака сабрана. I ўбачыце з-прад паўтысячы гадоў беларускія пісаныя кнігі і граматы; убачыце найстарэйшыя друкі беларускія, выходзіўшыя бадай адначчасна з першымі друкаванымі кнігамі ў Заходняй Эўропе; ўбачыце багатыя харàством сваім мастацкія рамесьніцкія вырабы, асабліваra характару рысункі і малюнкі беларускіх артыстаў. Убачыце цікаўны абраз нашага нацыанальнага і грамадзкага жыцьця з-прад многіх вякоў..

Але выстаўкі ў нас — гэта навіна, якой падмаскалямі бачыць не даводзілася. I людзём з вёсак раскіненых на бязмежным абшары Беларусі, ня лёгка даехаць да Вільні ці да Менска акурат у той час як там можна пабачыць старадаўныя скарбы нашай культуры. — Дык як пазнаваць ім сваю мінуўшчыну?

На гэта ёсьць кніжкі. Толькі йшчэ вельмі іх мала ў беларускай мове: нашы вучоныя гісторыкі вучыліся ў расейскай школе і па расейску-ж друкавалі свае досьледы аб роднай зямлі. Цяпер народ наш жджэ свае гісторыі ў роднай мове, — жджэ, каб яму расчынілі вочы на тое, чым ён быў і што меў у мінуўшчыне.

Даць народу добрую гісторыю Беларусі пабеларуску — гэта найбольш пільная задача сучаснага мамэнту. I ў гісторыі тэй ня гэтулькі трэба зьвяртаць увагу, які князь калі княжыў і хто быў насьледнікам яго, сколькі на гісторыю нашае культуры, каб мы мелі поўны абраз таго, што створана рукамі беларусаў.

Добрая гісторыя Беларусі павінна стацца настольнай кніжкай кожнага беларуса, а перад усім — кожнага беларускага вучыцеля, каторы павінен навучыць школьных дзетак шанаваць свой народ і сваё імя, як беларусы таго заслужылі. I мы спадзяемся, што нашы працаўнікі на нацыанальнай ніве, між каторымі ёсьць ужо спэцыалісты прафэсары, дадуць нашаму народу ў рукі той «сьветач мінуўшчыны», каторы асьвеціць «цемру будучыны», — такой яшчэ туманнай і загадачнай.

І. Мелешка.

У Вільні і ваколіцах.

× **Гродненскі Губэрскі Цэнтральны Камітэт.** Мы атрымалі з Пецярбурга вестку, што ў хуткім часе можна спадзявацца прыезду з Расеі у Вільню або ў Гродню гэтага Камітэту. Як нашым чытаром вядома, ў Вільню ў чэрвені месяцы прыяжджалі з Пецярбурга дэлегаты Гродненскага К-ту і мелі нараду з Беларускай Радай у Вільні аб супольнай працы К-ту з краёвымі беларускімі арганізацыямі.

× **Паварот беларускіх вучыцялёў.** У наш край ужо пачалі варочацца вучыцялі беларусы, працаваўшыя перад вайной у расейскіх народных школах у Беларусі. У Меншчыну, Гродненшчыну і Віленшчыну, вярнулася ўжо каля 200 вучыцялёў.

Надовячы да нас даведаўся адзін з вучыцялёў, прыбыўшый з апошняй партыяй, зложанай з 68 асоб. Ён апавядаў, што ўсе яго таварышы аднадушна рвуцца да роднага краю, каб працаваць між свaімі братамі

Апрача вучыцялёў, вярнулася многа беларусаў фэльчароў і іншых прафэсый.

† **Цэзар Кіуі.** Наш зямляк, композытар Кіуі, паводлуг швэйцарскіх газэт памёр у Расеі.

Кіуі радзіўся ў Вільні ў 1835 гаду. Ён служыў на ваеннай службе, дайшоўшы чыну гэнэрала і прафэсара ваеннай акадэміі. Вучыў яго тэорыі музыкі наш Манюшка. Кіуі прылучыўся да школы Рымскага-Корсакова і Мусургскага. Заграніцай з ім пазнаёміліся праз яго кнігу «La musique an Russie».

× **Беларускі тэатр.** У Беларускім Клюбе адбываюцца цяпер пробы п'есы „Як яны жаніліся". П'еса гэта намэчана на нядзелю, 22 верасьня.

Апрацоўваюцца дзеля пастаноўкі некалькі новых п'ес, перакладзеных з чужых моў. Будзем спадзявацца, што наша драматычная дружына дасьць нам магчымасьць бачыць сваю ігру на сцэне Клюбу прынамся што-другую нядзелю.

× Штадтгаўптман апавяшчае, што з прычыны дарагавізны апалу, з 1 кастрычніка падымаецца цана на электрычнасьць: а) за сьвятло кілё-ват-гадзіна будзе каштаваць 1 м. 50 фэн. б) за электрычную энэргію — 0,75 мр. за кілё-ват-гадзіну. Арэнда за электрычныя лічнікі паднята замест 1 мр. да 1 м. 50 ф. у месяц.

× У панядзелак 16 верасьня у 3 гадзіны параніцы стрэлкі ўсіх гадзіннікаў будуць перасунены на адну гадзіну назад і, так званы, летні час заменены зімовым.

× Каморніцкая школа на біскупскай 12, 2 пачынае ў сярэдзіне кастрычніка новы курс куды прымаюцца падданыя Літвы. Скончыўшым школу будзе дадзена месца каморніка. Вучаць у нямецкай мове. Апрача дармавой навукі кватэры і харчоў курсісты дастаюць у месяц па 20 мр. Ехаць у Вільню дарма. Курс 8 месяцаў. Заявы з кароткай біографіяй (век, рэлігія нацыянальнасьць, адукацыя) трэба падаваць свайму крэйсгаўптману.

× **Ліцытацыя** 26 верасьня ад 10 да 2 гадз. ў ліцытацыйнай салі мястовага лёмбарду адбудзецца прадажа з ліцытацыі нявыкупленых у тэрмін рэчаў.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошнія дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
12–13	+ 14,°	+ 9,9°
13–14	+ 14,8°	+ 8,9°
14–15	+ 13,5°	+ 8,5°
15–16	+ 14,6°	+ 6,8°

З усяго Краю.

З Менскага жыцьця.

= У чацьвер, 5 верасьня, адбылося адкрыцьце беларускіх вучыцельскіх курсаў і курсаў беларусазнаўства. Для курсістаў з правінцыі устроен інтэрнат на 25-30 душ. Усяго запісалася на курсы пакуль-што 60 асоб

Апрача таго апрацоўваецца плян устройства пастаяннай беларускай вучыцельскай сэмінары.

= **Менская жыдоўская газэта «Вэкэр»** піша, што ў пачтовых зносінах дапушчана і жыдоўская мова. Адгэтуль у межах новай окупацыі почта будзе прынімаць такжа пісьмы, пісаныя жыдоўскай народнай мовай, але дзеля зносін толькі ў гэтых межах.

Чорт і пастух.

(Беларуская казка.)

Пасьвіў пастух авечкі на лузе, і іграў ён у дуду. А дыявал выслухаў, што ён хораша іграе, надыйшоў ён да яго «Навучы ты мяне іграць у дуду, а я цябе навучу пісьма, і такога пісьма, штой папом будзеш». Пачаў перша пастух вучыць чарта ў дуду іграць. Вось ён ня кеміць. I пастух біў яго шмат за гэта; пакуль навучыў, дык ён яго балюча зьбіў. А вывучыў іграць добра. Потым пачаў чорт вучыць пастуха пісьма. Ён яго навучыў за адзін дзень, — не давялося яго яму набіць ні 'днаго разу.

Даждалі часу зімовага; статак зачынілі да самых каляд. Тады поп тае парахвіі паехаў да пана наймаць работнікаў. Ён за ім, гэты самы чорт, за папом; і зьвёў іх сварыцца і біцца з тым. Пан падаў ў консысторыю жалабу: „у мяне, кажа, будзе пастух папом!" Вось паклікалі папа ў консысторыю, там яго з папоўства далоў скінулі расстрыглі. А пастуха паклікалі так сама ў консысторыю, гэну самую. I на то стала, што зробілі папом гэнага пастуха.

I быў пастух да Вялікадня папом. На Вялікдзень стаў ён на абедзьню. Толькі закладаець проскомідзію, а ён ідзе з дудою, гэны самы чорт. «Наладзь, кажа, мне дуду! у мяне вясельле, — трэба іграць!" Ён яму ўзяў ды дуду наладзіў. „Цяпер, кажа, зайграй!"—на папа, на 'бедзьні. Ён не хацеў іграць, дужа не хацеў. Чорт кажа: „зайграй, а то і папом ня будзеш, калі не зайграеш!" Ён, нічога ня зробіш, узяў і зайграў на 'бедзьні. Людзі вельмі зьдзівіліся і падалі ў консысторыю таксама жалабу, што ён на бедзьні іграець. Вось яго тамацькі папыталі, чаму ён зайграў у дуду? Калі добра, кажуць, іграеш, дык зайграй тут, зайграй, кажуць. А чорт яму даець дуду. Дык ён зайграў, а дыявал падлез архірэю пад ногі, дык архірэй пайшоў скакаць.. I скакалі цэлае паўдня з ім, пакуль і замарыўся. Тады архірэй кажа: дос іграць. Дый дурань, кажа, хто гэта падаваў жалабу на дуду, на гэту! Гэта хораша. Даць яму дзесятае начальства! — гэта благачынства, значыцца. Дык яго зробілі благачынным, папа таго. Ён і дагэтуль папом.

Браты птушкі і сястра.

Жыў сабе дзед з бабай. I было ў іх тры сыны. Вось нешта было вялікае сьвята. Пайшлі яны ў царкву і там пасварыліся за нешта і сталі біцца. Матка ўвідзела, што яны б'юцца ў сьвята і сказала: ах, каб вы, мае сыночкі, так цэлы век свой біліся, як вы цяпер б'іцёся! Дык яны зара сталі птушкамі і паляцелі. Лятуць і б'юцца крыльлем, лятуць і б'юцца. Палядзела, палядзела тая матка, але што-ж ёй робіць? Свайго слова не вярнуць! Заплакала, дый пайшла дамоў. Тады гэта ўжо з таго часу, як яны паляцелі, прайшло ўжо гадоў з дзевяць. Ведома, скора казка кажацца, ды ня скора дзела дзеецца. Радзілася ў іх яшчэ дачка. Вырасла тая дачке вялікая, сталі ёй людзі казаць, што ў яе было тры браты, але матка пракляла іх, дык яны зробілися птушкамі і паляцелі. Дачка тая тады стала пытацца ў маткі: ці праўда гэта, што ў мяне было тры браты? — Праўда, кажаць, дачушка! — Напячы-ж мне, мамка, пірагоў і дай мне хлеба й масла, я пайду іх шукаць. Ну й пашла. Ісьці дык ісьці, ісьці дык ісьці, можа год, а можа два, відзіць перад сабой вялікую хату. Увайшла яна ў тую хату, ажно няма нікога, і на стале тры талеркі стаіць, і ля кожнае талеркі лыжачка ляжыць і скібачка хлеба. Тады яна залезла за печку і сядзіць там. Сядзела, сядзела, ажно прылятаюць тры птушкі. Як уляцелі, зараз скінулі з сябе пер'е, і сталі такімі малайцамі! Селі яны, павячэралі і лeглі спаць. Яна тады вылезла з-за печы, пазнала, што гэта яе браты. Абняла яна старшага брата і стала над ім плакаць. Плакала, плакала, ды ўзноў пайшла за печку і стала Богу маліцца. Назаўтрага ўстаюць браты, і гэны, вя-

Паварот жыдоўскіх уцекачоў.

«Volksblatt» наказывае, што да Менска прыехала дэлегацыя жыдоўскага камітэту апекі над уцекачамі, каб спазнаёміцца з ходам паравароту ўцекачоў. Дэлегаты выясьнілі, што ў Ромнах знаходзіцца 10.000 сямей жыдоўскіх уцекачоў, з паміж каторых 2.000 сямей атрымліваюць пастаянную падмогу, а рэшта — ад часу да часу. Пераважная часьць іх — з Ковеншчыны. Камітэт выдае ім бясплатна білеты і страву на дарогу. Партыі уцекачоў пры пaverоце укладаюцца гэтак, каб між імі былі і багатыры, і сярэдняазаможныя людзі, і бедныя, дык каб багатыя пакрывалі часьць выдаткаў на паварот бедных.

Доля Інфлянтаў.

Як ведама, паветы: Рэчыцкі, Дзьвінскі і Люцынскі, маюць гістарычны назоў Інфлянты. Гэтая зямля мае 275 кв. міль і на ёй жыло перад вайной 650 тысяч людзей. Жыхары латышы і беларусы. Апрача гэтага там жывуць жыды, «палякі», літвіны і немцы. Між латышамі ёсьць прапаганда, каб Інфлянты былі прылучаны да Балтыцкага краю.

На свайм апошнім засяданьні мястовая дума ў Рызе займалася гэтым пытаньнем. Казалі, што гандлёвыя ратрэбы Рыгі патрабуюць гэтага прылучэньня. Потым прынята аднагалосна рэзалюцыя латыша Вэймбэрга, каторая кажа: граданачальніка Рыгі просяць перадаць нямецкаму ўраду жаданьне Рыгі, каб Рэчыцкі, Дзьвінскі і Люцынскі, а таксама латыскія часьці паветаў Астроўскага і Дрыскага былі прылучаны да Балтыцкай дзяржавы.

ГГОДНЯ. У апошнім часе тут было многа прыпадкаў крадзежаў скуры з рамізьніцкіх брычак. Удалося злавіць аднаго гэткага злодзея, Габрука Буцьвілоўскага, каторы уламаўся ў рамізьніцкую вазоўню і з украдзенай скуры пашыў боты. Яго засудзілі на 9 месяцаў у вастрог.

ШАШАЙТЫ, кальварыйскага пав. Гаспадар Сілкаўскас схаваў 2.000 м. пад страхой свае стайні. Гэтымі днямі ён перакануўся, што грошы стуль прапалі.

КРЭЙХБУРГ. 15-гадовы Аболін знайшоў бомбу і пачаў стукаць па ёй камянём. Бомба ўзарвалася і дасло́ўна разарвала хлопца на кускі.

РЫГА. Папеж назначыў за біскупа адноўленай рыскай дыэцэзіі гр. О'Рурка.

ДЭГУЦЕ, Мар'ямп. пав. Вядомы канакрад, Піус Сэнуркас, за новае зладзейства засуджан на год у вастрог.

БЕЛАСТОК. На гранічнай вуліцы зладзеі, выламаўшы вакно, укралі з кватэры 160 срэбных рублёў.

СЭЙНЫ. Зладзеі ўкралі з суседняга млына раменных пасоў больш, як на 1000 руб.

СУВАЛКІ. У аднаго жыхара выкрылі некалькі скур з бітай без пазвалення скаціны. У другога знайшлі толькі што забітую сьвіньню; агледзіўшы, аказалася, што ў яе ёсьць трыхіны. Скуры і мяса сканфіскавалі а валадзельцам паштрафавалі.

МІТАВА. У тую суботу ўвечары на вагзале узьняўся пажар. Згарэў адзін будынак.

БЕЛАСТОК. Уласьці пазволілі зрабіць жыдом новыя выбары членаў ураду жыдоўскае грамады. Парадак выбараў апубліканы ў апавяшчэньнях, наклееных на вуліцах.

СУВАЛКІ. У сувальскім павеце ў апошнім часе было шмат многа крадзежаў скаціны. Дагэтуль не ўдалося папасьці на сьлед зладзеяў.

ДРАБУШЧЫН. У спальню арэндара Лазьдзіна і жонкі яго кінуты ў ночы дзьве ручныя гранаты. Муж і жонка забіты на сьмерць. Забіўства зроблена, трэба думаць, дзеля помсты.

МАЕУКА. Тут укралі карову і двое цялят і загналі іх неўдалёку ад вёскі, ў лесе.

ШАЛКОЎШЧУНА. Сялянін Вінцэнт Казакевіч у мінулую вясну пакраў 6 каней. Ён засуджан на 3 гады ў вастрог.

ТАЛОЧКІ. Варочаючыся з вечарынкі, на 3 хлопцаў напалі шасьцёра іншых, каторыя іх крэпка пабілі. Аднаго з пабітых прыйшлося адвесьці ўраз-жа ў бальніцу; другі, цяжка ранены ў галаву, ляжыць блізкі да сьмерці. Трое з нападаўшых—вярнуўшыяся ўцекачы.

ГРОДНЯ. У аднэй дзяўчыны на Сувораўскай вуліцы пакралі рэчы на 2000 марак. Досьледы паказалі, што гэта работа яе брата і палюбоўніцы яго, вярнуўшыхся ўцекачоў. Зладзеі здалелі ужо выслаць украдзеныя рэчы ў Беласток, але паліцыя вярнула іх адтуль.

Украіна.

ОДЭССА. Досьледы выкрылі, што ініцыятары ўарыву—саюзьнікі, каторыя за апошнія тыдні церяз сваіх агентаў падбівалі работнікаў дазабастоўкі. Забастоўка павінна была пачацца 31 жніўня, і ў гэты дзень быў ўарыў.

КІЕУ. Газэта „Голас Кіева" з пэўнай крыніцы даведалася, што ёсьць магчымасьць дайсьці мірнай угоды між Украінай і Расеей на аснове ўзаемных уступак.

З ФІНЛЯНДЫІ.

КОПЭНГАГА. З Гэльсінгфорсу наказываюць, што прынц Фрыдрых-Кароль Гэсэнскі, швагра нямецкага імпэратара, згадзіўся прыняцьь каралеўскую карону Фінляндыі.

БЭРЛІН. Кандыдатуру прынца Гэссэнскага на фінляндзкі пасад монархісты горача вітаюць. Рэспубліканскія газэты наказываюць аб самым факце бяз ніякіх дадаткаў ад сябе.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

Беларуская работа.

МАСКВА. (ад нашага карэспандэнта). У сталіцы сучаснае Расеі забралося вельмі многа беларусаў эвакуованых з роднага краю пры адступленьні расейскай арміі. Жыцьцё іх — даволі цяжкое: ў чужацкай атмосфэры, між чужымі людзьмі, здалёк ад Бацькаўшчыны для каторай ім вельмі хочацца працаваць. Але атрымаць пазваленьне на выезд дажджацца «эшалону» — гэта вельмі нялёгкая справа. І вось, седзячы тут, нашы беларусы спасобяцца на будучыну да працы на роднай ніве

Гэтак, Беларускі Камісарыят нядаўна арганізаваў беларускія трохмесячныя курсы для падгатоўкі да навучаньня за межамі школы Курсы былі наладжаны пры вышэйшых жаноцкіх курсах. Лекцыі чыталі прафэсары унівэрсытэту, ды пры гэтым асаблівая ўвага была зьвернена на беларусазнаўства. Паміж іншым, чытаў свае лекцыі пабеларуску прафэсар Пічэта, вядомы сваімі працамі над гісторыяй Беларусі.

ЛОНДОН. Газэты наказываюць што палажэньне ў Пецярбурзе і Маскве — вельмі сур'ёзнае. У большэвікоў у няволі знаходзіцца больш за 1 000 англічан.

МАСКВА. „Праўда" наказвае, што Ленін зьвярнуўся з гэткай адозвай да рад народных камісараў: „Чэска - славацкіе небасьпечныць усё павялічываецца. З кожны днём мы пераконываемся ўсё балей, што мы адны сл бые. Для рад ёсьць толькі адзін выхад — гэта саюз з другой дзяржавай. Каб ўратаваць уласьць работнікаў і сялян, мы не павінны адкінуць навет саюз з імпэрыялістамі".

МАСКВА. Троцкі наказаў сібірскаму галоўнакамандуючаму генералу Алексееву, што за кожнага большэвіка, забітага чэха-славакамі, або контррэвалюцыянерамі будзе забіты афіцэр Алексееў адказаў, што калі будуць забіты афіцэры, дык ён будзе датуль мсьціцца, пакуль усе жыды ў Расеі ня будуць выбіты.

МАСКВА. У адказ за пакушэньне на Бера на растрэлена 79 контррэвалюцыянераў.

КІЕУ. (П.Т.А.). Большэвікі дайшлі на заход Царыцына Дону. Ля Нежнярэчынскай казакі адышліся назад на правы бераг Дону.

У Кацярынадар прыбыў Пурышкевіч і б. міністар прэзыдэнт князь Львоў. Чакаюць прыбыцьця вядомага правага, Маркова.

МАСКВА. Жонка, сын і матка Керэнскага запісаны ў чысло заложнікаў.

Паводлуг вестак савецкага ўраду, 12 верасьня паабедзе заняты Сімбірск. Савецкія войскі гоняцца за ўцякаючымі ворагамі і знаходзяцца ужо ў 20 вярстах на ўсход ад места. Так-жа ўдачнае наступленьне ўрадовых войск на паўдня ад Самары. У Варонежы сталася ад узрыву катастрофа; зьніштожаны 6 поездаў і вагзал. Страты даходзяць 30 мільёнаў руб. Забітых — каля 300 душ, раненых каля 1.500.

ЛОНДОН. «Times» наказывае што саюзьнікі пастанавілі афіцыяльна абвясьціць Расеі вайну. Найбліжэйшай і галоўнай мэтай саюзьнікаў ёсьць скінуць больш.

МАСКВА. Народны камісар унутраных спраў, Пятроўскі, цыркулярна наказаў мясцовым радам,

---

люкшы, брат кажа: што я, браткі, сяньня сьню! Здаецца, што ў нас дома ёсьць сястра, і яна нада мною плакала сенечы. Тады яны паснедалі, надзелі на сябе пер'е і паляцелі. А яна выскачыла з-за печы дый глядзіць у вакно, куды яны палятуць. А яны ўсё лятуць і б'юцца крыльлем. Захацелася ёй есьці. Яна ўзяла адламіла кусочак хлеба ў вялікшага брата і зъела. А сама ўзноў села за печку і сядзіць. Увечары прылятаюць яны ўзноў утраіх. Скінулі з сабе пер'е і сталі вячэраць. Палядзяць, аж у старшага брата адломлена кусочак хлеба. Што гэта думаюць: нікога ў хаце няма, а адломлена кусочак хлеба? Павячэралі, ляглі спаць. Яна тады вышла з-за печкі і стала плакаць над сярэднім братам. Паплакала і пайшла ўзноў за печку і стала Богу маліцца. Назаўтрага прачнуліся яны, вось сярэдні брат і кажа: ці ведаеце, браточкі, што я сяньня сьніў? Здаецца, быццам нашая сястра нада мной плакала! Ажно вось трошку капуля мая мокрая! А таго ня ведаюць, што яна ў хаце ў іх ёсьць. Тады паснедалі, пер'е на сябе надзелі і паляцелі. Ды ўсё б'юцца! ды ўсё б'юцца! Захацелася ёй есьці. Яна ўзяла адламала кавалачак хлеба ў сярэдняга брата і зъела. Палезла ўзноў за печ і сядзіць, Богу моліцца. У вечары прылятаюць яны ўзноў. Скінулі пер'е, селі вячэраць. Палядзяць, а ў сярэдняга брата каваллачак хлеба адломлена. „Не, кажа, браткі, нехта ёсьць у хаце і сталі шукаць. Алітку не знайшлі і ляглі спаць. Тады яна вылезла з-за печкі, падышла да меньшага брата і стала плакаць. Пагаласіла, пагаласіла і ўзноў пайшла за печ і стала Богу маліцца. Назаўтрага ўсталі яны, і гэты ўжо, меньшы, брат кажа: што я, браточк, сенечы сьніў? Што здаецца, нашая сястра нада мной галасіла, аж во дзе капуля трохі мокра! Пагаварылі, пагаварылі дый паляцелі б'юцца. Яна адламіла кусочак хлеба ў меньшага брата, з'ела, дый пайшла за печку. Сядзіць ды ўсё Богу моліцца. Увечары прылятаюць яны; скінулі пер'е і селі абедаць. Калі палядзяць, аж у меньшага брата адломлена кавалак хлеба. Тады сталі яны гаварыць паміж сабой. Вялікшы кажа: я, каб яе цяпер увідзець, дык бы сякерай засек! А сярэдні кажа: я яе-б ножам зарэзаў! А меньшы кажа: а к б я яе цяпер увідзеў, дык бы дужа бы бы рад! Яна тады з за печы выскачыла, апшчапіла яго і стала над ім плакаць. І яны ўсе сталі рады і сталі плакаць. Тады яна стала прасіць іх: хадзеце вы дамоў! Вас дужа прасіла мамка і татка! А яны кажуць: тады мы будзем тваё браты, і пойдзем дамоў, як ты адбудзеш тры гады немай! Ускінулі яе на сваё крыльле і занясьлі яе ў вялікую пушчу. Кінулі яе там у гэнай пушчы, а самі паляцелі, куды ім трэба было. Нешта, аднаго дня, хадзіў па гэнай пушчы кароль на палянаньню з лякаём, з сваім Сабакі таго каралля знайшлі гэную нямую і сталі на яе брахаць. Паслаў кароль лякая палядзець, хто там ёсьць. Лякай схадзіў палядзеў, і кажаць: нейкая кабета сядзіць на ябліне; дужа прыгожая, але нічога не гаворыць. Пайшоў тады палядзець кароль сам, і яна дужа яму падабалася. Ён загадаў зьняць яе адтуль і пачалаваў, а тады ўзяў да сябе дамоў і ажаніўся з ёй. А яна як была нямая дык і есьць. Тады матчыха таго караля ня ўзьлюбіла яе, што ён з нямой ажаніўся. Стала яна яго падбіваць, стала прэзнушчаць, каб як-ні-як яе перавесьці. Прайшоў адзін год, і другі год, а на трэці яна яму гворыць; што хочаш, тое з ёй роб: ці на 'гні спаль, ці зьвязі, каб толькі мяне вочы ня ўбачыдзелі яе! Ну, дык ведама: і жонку шкода і не паслухаць матчыху ня можна. Узяў загадаў слугам раскласьці цяпло і ўкінуць яе ў вагонь! Укінулі яе раз у вагонь, —яна перакацілася цераз цяпло, і нічога. Тады другі раз укінулі, яна ўзноў перакацілася. Перапужаліся ўсе: Госпадзі, тут нешта ёсьць! Алітку раскалілі жар і ўкінулі не трэці раз. Яна ўзноў выкацілася з агню, і ўсё маўчыць. Тут зара прыляцелі яе браты, узялі яе на крыльле і панясьлі дамоў. Прынясьлі дамоў і зробіліся людзьмі. Бацькі іх сталі дужа рады. І з гэтае радасьці ўпіліся. І я там быў, мёд віно піў, па барадзе цякло, ды ў губы не папала.

што пры першай контррэвалюцыйнай змове павінны быць застрэлены закладнікі, што ёсьць у руках ураду.

Здароўе Леніна ўсё лепшае. — Ен ужо можа сядзець. Максім Коркі прылучыўся да большэвікоў. Ен сказаў, што пакушэньне на Леніна прымусіла яго пайсьці на гэта.

ПЕЦЯРБУРГ (В.Т.В.). 13.IX. Газэты друкуюць вострыя стацьці проці быцьця саюзьнікаў у Паўночнай Расеі. Былі вялікія сабраньні работнікаў і салдатоў, каторыя прынялі варожыя саюзьнікам рэзалюцыі.

БЭРЛІН. Першы нямецкі параход, што прыбыў пасьля вайны ў Пецярбурскі порт, нрывёз каменнае вугальле і адвязе трысьнік, каноплі, лён, медзь, шэрсьць, конскае волосьсе і старое жалеза. З прычыны скорай зімы пытаньне каменнага вугальля для Пецярбурга — гэта пытаньне жыцьця і сьмерці.

1 чэрвеня сёлетняга году ў Пецярбурзе было 1 мільён 478 тысяч жыхараў, а 1 лістапада 1915 г. 2 мільёны 348 тысяч.

КІЕУ. Згодна з упорнымі пагалоскамі блізка Кацярынбурга забіта б. чарыца і яе 4 дачкі.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 13.IX. Імперскі канцлер прыняў учора дэпутацыю 6 прафэсыанальных саюзаў і сказаў ёй: «Я крэпка перакананы што мы бліжэй да канца вайны, чым думае публіка. Я цьвёрда стаю на грунце агульнага выбарнага права ў Прусах і ня пристану ні **на якія ўступкі. У** патрэбе мы распусьцім правадаўчыя ўстановы».

Тэлеграмы.

Нямецкія апавяшчэньні.

13.IX. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генерал-ан-шэфа ф. Бэн'а: На ўзьбярэжжы мы зрабілі ўдачныя опэрацыі. Між Іпр і Армант'ер адбіты наступленьні ворагаў. Між Арра і Пэррон, пасьля сільнай падгатоўкі агнём, ворагі далей вялі свае штурмы, каторыя адбіты з цяжкімі стратамі. Аврэнкур—у руках ворагаў. Вячорныя атакі між Мэвр і Гузокур адбіты.

Фронт нямецкага Насьледніка: Між Айет і Эн—дробная стычкі, у часе каторых мы ўзялі палонных.

Фронт ф. Гальвіца: Французы і Амэрыканцы атакавалі ўчора луку пры Ст. Мель, а такжа між Кот Лёрэнь і Мозэль Мы ўжо даўно зьбіраліся ачысьціць гэты высунены ўпярод вугол і не вялі бітвы да канца, а зрабілі намэчаны рух. Наступленьні французаў на вяршыны на ўсходзе ад Масу адбіты. Вяршына Комбр, часова намі ўтрачаная, контратакай вернена намі назад. Далей на паўдня аўстрыяцка венгерскія палкі разам з нашымі войскамі між Маасам і Мозэлем, зьдзержывалі ворагаў у часе нашага руху ў луце пры Ст. Мель. Між Кот Лёрень і Мозэль ворагі пасунуліся ўпярод у кірунку Тіокур. Ворагаў задзяржалі рэзэрвы. У начы наш рух быў закончаны.

14.IX. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага і генерал ан-шэфа ф. Бэн'а: На паўночна-ўсход ад Вікс-Шот мы адбілі наступленьне непрыяцеля і ўзялі палонных. Ля Мэвр і Аврэнькур вялікія бітвы. Наступленьне непрыяцеляў проціў Гузокур на поўнач ад Вэрман і наабапал дарогі Гам-Сан-Кантэн адбіты.

Фронт нямецкага Насьледніка: Між Айет і Эн непрыяцель атакаваў пасьля вялікага прыгатаваньня агнём, але быў адкінены перад нашымі лініямі. Артылерыйская дзейнасьць між Эн і Вэль.

Фронт ф. Гальвіца: На паўдня ад Орнь і ля дарогі Вэрдэн і Т'ен адкінены наступленьні непрыяцеля. На фронце бітваў між Кот Лёрэнь і Мозэль спакойны дзень. На ўсход ад Т'іокур мясцовыя бітвы.

15 верасьня.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Наабапал каналу Лябассэ адбіты наступленьні ворага. Ля Аврэнкур англічане ўзноў пачалі свае атакі. Яны адціснулі нас трохі ад канца вёскі. Увечары пасьля вялікай артылерыйскай падгатоўкі мы павялі контратаку і захапілі ўтрачаныя нараніцы пазіцыі. Непрыяцель меў вялікія страты і пакінуў каля 100 палонных у нашых руках.

Фронт гэнэрал-ан шэфа ф Бэн'а: Наступленьні ворага ля ручча Омініьёп адбіты.

Фронт нямецкага Насьледніка: Цяжкія бітвы між Байет і Эн. Пасьля многа гадзіннага прыгатаваньня агнём французы атакавалі вялікімі сілы. Наабапал Айет атакі непрыяцеля адкінены. Непрыяцель пасунуўся на ўсход ад Ляфон да даліны Альман. Тут нашыя контратакі яго задзяржалі. Між Сансі і Ваі паўторныя штурмы непрыяцеля ўзмацаваныя панцырнымі аўтомобілямі зламаліся перад нашымі лініямі. На паўдня ад Эн сэнэгальскія нэгры атакавалі між Рэвіён і Румэн. Паўторныя штурмы ворагаў адкінены ды мы ўзялі больш 100 палонных.

Фронт Гальвіца: Наабапал дарогі Вэрдэн і Тэн адкінены наступленьні непрыяцеля. Між Кот Лёрэн і Мозэлем непрыяцель атакаваў пры помачы панцырных аўтомобіляў, але быў адкінены.

Мы зьбілі ўчора 9 шароў на прывязі і 45 самалётаў.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ЛОНДОН (Рэўтэр). 12.IX. Льлёйд Джордж у Манчэстэры сказаў паміж іншым:

„Канец вайны павінен быць у прымусе Нямеччыны да пастаяннага і даўгога міра. Гэткі мір можа быць зроблены, калі брытанская нацыя ня страціць мужасьці і выдзержыць да канца. Калі-б цяперашняя вайна ня была апошняя, дык гэта азначала-б канец цывілізацыі". Льлёйд Джордж скончыў сваю прамову словамі: „Мы будзем біцца да канца!" Вялікае плясканьне ў далоні.

Ўвага рэдакцыі: Нямецкая ўрадовая газэта „Nord. Deut. Allg. Ztg.» піша з прычыны гэтае прамовы: «Англіцкі міністэр - прэзыдэнт зьдзекуецца над сабой і сваймі слухачамі. Дыкжэ сваёй прамовай ён паказвае, што ад яго і ня можна спадзявацца даўгога міра".

БАЗЭЛЬ. Лянсдаўн заклаў новую англіцкую партыю, каторай праграма гэткая: 1) Паразуменьне, 2) разброеньне, 3) трэцейскі суд, 4) прыняцьце немцаў у саюз народаў, 5) адмова ад эканаміцкай вайны пасьля міра.

БЭРН. Англіцкія газэты жаляцца на агітацыю сін-фэйнэраў проціў рэкруцкага набору ў Ірляндыі. Ува ўсім краі дагэтуль удалося набраць толькі 4.600 самахвотнікаў.

АМСТЭРДАМ. Ад 10 да 14 жніўня ў Чыкаго быў конгрэс амэрыканскіх соцыалістаў. Была аднагалосна прынята рэзалюцыя весьці далей у часе вайны палітыку ўгоды, важнейшым тэзісам каторай ёсьць думка што абвяшчэньне вайны Амэрыкай Нямеччыне — гэта праступак.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). У паўночным моры нашы падводныя лодкі затапілі 10.000 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.Б). Навакол Англіі падводныя лодкі затапілі 9.000 тонн.

Абвесткі.

С прычыны даражыні паперы і ўсё ўзрастаючай платы работнікам адміністрацыя „Гомана" прымушана па прыкладу другіх газэт павялічыць цану свае газэты.

Пачынаючы ад 1 кастрычніка 1918 году асобны нумэр „Гомана" будзе каштаваць 10 фэн., за месяц у месьце — 70 фэн., ва ўсім краю і заграніцай — 90 фэн.

Беларускія Вучыцельскія курсы у Сьвіслачы.

Ад 15 кастрычніка 1918 г. да 15 жніўня 1919 г. ў Беларускай Сэмінарыі ў Сьвіслачы будзе адбывацца новы элемэнтарны курс для беларускіх вучыцялёў і вучыцеляк.

Адпаведныя кандыдаты і кандыдаткі ад 18 да 30 гадоў могуць заяўляцца ў сваіх крэйсамтах; мясцовыя—проста ў кіраўніка курсамі інспэктара Бэндзехі, у Сьвіслачы. Там-жа яны даведаюцца аб варунках прыёму.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.